ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 29 (862) ● ПЯТНІЦА, 27 кастрычніка 1972 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

## *УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР*

### АБ ПРЫСВАЕННІ ГАНАРОВЫХ ЗВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫМ РАБОТНІКАМ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ РЭСПУБЛІКІ

ЗА ВЯЛІКІЯ ПОСПЕХІ Ў РАЗВІЦЦІ НАВУКІ І ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ, У ПАДРЫХТОЎЦЫ І КАМУНІСТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПРЫСВОІЦЬ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

### ЗАСЛУЖАНАГА ДЗЕЯЧА НАВУКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

**Некрашэвічу** Ільі Рыгоравічу — загадчыку кафедры Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна.

**Шкляру** Міхаілу Яфімавічу — прафесару Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ф. СУРГАНАЎ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Л. ЧАГІНА.
25 кастрычніка 1972 года. гор. Мінск.

# ПА ПЫТАННЯХ ЭТЫКІ

На мінулым тыдні ва універсітэце адбыўся рэспубліканскі семінар выкладчыкаў марксісцка-ленінскай этыкі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў БССР. Яго адкрыў намеснік міністра М. І. Красоўскі. Ён падкрэсліў выключна важную ролю курса этыкі ў камуністычным выхаванні моладзі, у тым ліку і студэнцкай, адзначыў значную работу кафедры гісторыі філасофіі і логікі БДУ ў падрыхтоўцы выкладчыкаў праз аспірантуру, у арганізацыі навуковых даследаванняў па актуальных праблемах гісторыі і тэорыі этыкі, метадычную дапамогу вузам і тэхнікумам рэспублікі, развіццё інтарэсу студэнцтва да гэтай дысцыпліны.

З дакладамі выступілі вучоныя рэспублікі і краіны: заслужаны дзеяч навукі БССР, доктар філасофскіх навук, член-карэспандэнт АН БССР І. М. Лушчыцкі («Асноўныя этапы ў развіцці этычных вучэнняў»); дэкан філасофскага факультэта Уральскага універсітэта доктар філасофскіх навук, прафесар Л. М. Архангельскі («Сутнасць і формы камуністычнай маральнай свядомасці»); намеснік загадчыка аддзела навукі ЦК КПБ доктар філасофскіх навук Я. М. Бабосаў («Крытыка сучасных буржуазных этычных сістэм»); кандыдат філасофскіх навук, дацэнт БДУ С. Д. Лапцёнак («Навукова-метадычныя прынцыпы выкладання курса «Асновы марксісцка-ленінскай этыкі»); кандыдат філасофскіх навук, дацэнт МДУ Л. Б. Волчанка («Асноўныя катэгорыі марксісцка-ленінскай этыкі»); кандыдат філасофскіх навук, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі АН СССР Э. Б. Гудзіліна («Асноўныя праблемы простых норм маральнасці і справядлівасці»); старшы навуковы супрацоўнік інстытута філасофіі і права АН БССР, кандыдат філасофскіх навук М. І. Бароўскі («Крытэрый маральнасці і ацэнка ўчынкаў чалавека»).

Семінар выклікаў вялікі інтарэс у прысутных. Выкладчыкі этыкі не толькі папоўнілі свае тэарэтычныя веды, але і атрымалі шэраг каштоўных метадычных указанняў.

У рабоце семінара прынялі ўдзел начальнік аддзела выкладання грамадскіх навук Мінвуза БССР в. а. прафесара П. П. Дронь, намеснік загадчыка аддзела навукі Мінскага абкома КПБ М. С. Марціновіч, рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі, адказныя работнікі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

**Л. СЯРГЕЕЎ.**

*НА ЗДЫМКУ: супрацоўнікі фізічнага факультэта (злева направа) І. Жалнярэвіч, І. Папечыц, Л. Бураў і С. Мітакі абмяркоўваюць тэарэтычныя пытанні палярызаванай люмінесцэнцыі.*

*Фота Г. МАРОЗАВА.*



# ВЕСТКІ З ЮРФАКА

Зараз на ўсіх факультэтах ідзе падпіска на газеты і часопісы. І ад таго, як да яе аднесліся адказныя за гэту справу, залежыць вельмі многае. На юрыдычным факультэце ўжо некалькі гадоў запар адказнай за падпіску выбіраюць Любу Шаройка. І гэта невыпадкова. Энергічная і дзелавая дзяўчына, яна заўсёды імкнецца выканаць даручаную справу добрасумленна і ў тэрмін. Гэта па яе прапанове, каб як мага лепш і хутчэй правесці падпісную кампанію, у кожнай групе створан штаб, у склад якога ўваходзяць камсорг, намеснік па ідэалагічнай рабоце, намеснік па арганізацыйнай рабоце і адказны за падпіску. І вынікі ўжо бачны. Першы курс юрфака, напрыклад, завяршыў падпіску. Першакурснікі будуць атрымліваць 451 экземпляр перыёдыкі, у тым ліку 95 часопісаў «Малады камуніст».

Вялікую работу сярод сваіх аднакурснікаў правялі сакратар камсамольскай арганізацыі курса Генрых Пятроў і намеснік па ідэалагічнай рабоце Юрый Падольскі.

Актыўна ўключыліся ў падпісную кампанію і астатнія курсы факультэта.

* * *

Работнікі юстыцыі аддаюць вялікую ўвагу прапагандзе юрыдычных ведаў сярод падлеткаў. На дапамогу ім прыходзяць і студэнты юрыдычнага факультэта. На III—V курсах юрфака на працягу некалькіх год працуе лектарская група, члены якой выступаюць з дакладамі перад вучнямі школ Заводскага і Кастрычніцкага раёнаў сталіцы.

Ужо сёлета маладыя лектары прачыталі ў школах Мінска звыш 50 лекцый. Асаблівую цікавасць выклікалі даклады трэцякурснікаў Л. Шарпака «Крымінальная адказнасць непаўналетніх», А. Дудзіча, А. Макаля, В. Каспяровіча і іншых.

— Наша лектарская група працуе ў кантакце з партбюро, члены якога даюць маладым лектарам многа дзелавых прапаноў, падказваюць новыя тэмы, — гаворыць сакратар камсамольскай арганізацыі юрфака Віталь Шкарупа. — Кіруе лектарскай групай намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце Анатоль Бяржанін. Акрамя таго, вялікую дапамогу аказваюць маладым лектарам пяцікурснікі Анатоль Прымачонак, Аляксандр Бакунін, Сяргей Бойка, Валерый Вашчанка і іншыя. Таму даклады атрымліваюцца вельмі цікавымі.

**Н. НОВІКАВА.**

# АДКУЛЬ ІДУЦЬ «ХВАСТЫ»?

**ДЫЯЛОГ ПЕРШЫ:**

— Добры дзень!

— Ну, Света, пераздала залік?

— Не.

— Што ж, стыпендыю не атрымаеш.

— ?!

**ДЫЯЛОГ ДРУГІ:**

— Ягор Андрэевіч, дык я ж ужо пераздаў.

— Але ўсё роўна стыпендыю даць табе мы не маем права. Ты ж знаёмы з новым палажэннем?

— Ну, дайце!

— Хіба толькі са сваёй зарплаты.

— А можа неяк можна выкраіць, а?

— ?!

Ужо забыліся трывогі летняй сесіі. Трывогі зімовай яшчэ не надышлі. Студэнт з падручнікамі і заліковай кніжкай перад дзвярыма аўдыторыі цяпер, згадзіцеся, выглядае «не па сезону». Аднак не-не, ды і стаіць ён нават цяпер, выслухоўваючы запозненае «ні пуху...». Здаюць «хвасты».

Гавораць, што рыба гніе з галавы, а студэнт—з «хваста». Дык адкуль жа бяруцца яны, гэтыя самыя «хвасты»?

На працягу некалькіх год лічба запазычнікаў на фізфаку — 10—12 працэнтаў— не мяняецца. У апошнюю летнюю сесію 236 чалавек атрымалі двойкі. 60 з іх не пераздалі экзамены і залікі яшчэ да сённяшняга дня.

У размове з такімі «героямі» і ў гутарцы з намеснікам дэкана факультэта Я. А. Піскуновым удалося высветліць некаторыя прычыны паяўлення адстаючых.

Юрыя Хітруна ў мінулым годзе залічылі на аддзяленне радыёфізікі амаль што па-за конкурсам. Не паглядзелі тады, што атрымаў ён менш балаў, чым яго сябры: хлопец з вёскі, працаваў ужо, служыў у арміі. Карацей кажучы, паспадзяваліся тады на яго сумленнасць. Але... Іменна Юра адзін з групы атрымаў адразу дзве нездавальняючыя адзнакі. І да гэтага часу не можа пазбавіцца ад іх. Два разы хадзіў пераздаваць вышэйшую алгебру. Дайшло да таго, што выкладчыца Р. Ф. Апацёнак адмовілася зноў выслухоўваць яго адказы. А Юра сцвярджае: «Я ж ведаў, ну, калі не ўсё, дык хоць нешта...» Ведаў крыху. А мог усё, каб з самага пачатку больш увагі ўдзяляў самастойнай рабоце. Тым больш, што добра ведаў аб сваіх прабелах.

Саша Ачкоў з таго ж II курса ўжо пераздаў экзамен па вышэйшай алгебры. Пры размове адчуваў сябе вельмі няёмка. Па ўсім відаць было, што «хвасцізм» у яго—не хранічнае захворванне. Ды і Ягор Андрэевіч сцвярджае, што часам падленьваецца хлопец.

— Але ж, бывае, і вывучыш, здаецца, усё, — гаворыць Саша, — а экзамен праваліш. А іншы лёгка праскочыць. А потым хваліцца: здаў, маўляў, «на халяўку». Вось тады крыўдна бывае.

Мы пагадзіліся з Сашам. І так бывае. Тут ужо многае залежыць ад выкладчыка, ад яго педагагічнага таленту. А што залежыць ад саміх студэнтаў?

— Уменне зноў і зноў працаваць самастойна, — гаворыць Я. А. Піскуноў.— Фізіка нялёгкая навука і любіць яна цікаўных і вынослівых. Ёсць у нас яшчэ і такія студэнты, што ідуць на фізфак, паддаўшыся модзе: фізік — чалавек веку. Потым яны разумеюць памылку, але часцей «цягнуцца» ад курса да курса. І мы ім часам у гэтым дапамагаем. Замест таго, каб выключыць адразу, нянькчымся ўсе пяць гадоў. Таму і атрымліваецца, што студэнты Сазонаў, Тадэуш і Гладкоў дайшлі ўжо да V курса, а ад двоек не пазбавіліся. І кожны дзень прыходзяць прасіць стыпендыю...

* * *

Па паспяховасці юрыдычны факультэт у мінулую сесію заняў першае месца. Але 18 чалавек (2,3 працэнта) атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Па словах намесніка дэкана У. М. Бохана, самае дрэннае становішча на IV курсе. 38 чалавек непаспяваючых, сямёра маюць двойкі па грамадзянскаму праву. У асноўным гэта студэнты, якія ўпершыню трапілі ў спіс непаспяваючых. Але на II курсе Маладцоў, на III—Кісялёў маюць па дзве двойкі.

ВАЛЯ ХЛАПЯНІК (IV курс):

— Самым адказным у мінулую сесію быў экзамен па грамадзянскаму праву. А ў мяне так атрымалася: я член СБА, мне трэба было раней выехаць з Мінска. Я экзамен проста не паспела здаць...

Удзел у будаўнічых атрадах, спартыўных зборах, пуцёўкі ў санаторыі ці яшчэ куды часта прымушаюць студэнтаў здаваць сесію раней тэрміну. І бывае, што не ў кожнага хапае сіл зрабіць гэта. Вось і едуць будаваць, спаборнічаць, адпачываць, маючы даўгі, якіх магло б і не быць.

— Адкуль «хвасты»? У многіх выпадках вінавата школа. У мяне незалік па замежнай мове. У школе меў выдатную адзнаку (хоць і не ведаў на выдатна), ва універсітэце хацеў бы вывучаць другую мову, не нямецкую. Мне не дазволілі перайсці ў другую групу, паколькі ў атэстаце стаіць «выдатна». Вось і атрымалася — прадмет запусціў, цяпер трэба ўсё занава паўтараць.

Гэта расказвае А. Гаўрон, студэнт IV курса журфака. «Школа ў многім вінавата... Не люблю прадмет»— гучыць непераканаўча. Хутчэй, няма адказнасці, стараннасці, сілы волі, каб неяк змяніць становішча.

Іра Красоўская, адказная за акадэмічны сектар IV курса юрфака, шчыра падзялілася сваімі меркаваннямі аб акадэмічным даўгу.

— Што гавaрыць: лянуюцца многія. Ёсць здольныя студэнты, ім дастаткова пералістаць канспект, каб адказаць на экзамене, але часам паспадзяюцца на «авось» — ну і...

Бывае ўсякае. Бывае, што студэнту не хапіла той адной ночы для падрыхтоўкі, не прачытаў адну-дзве тэмы і якраз выцягнуў той білет. Бывае, што адыграў нейкую ролю псіхалагічны фактар: нешта здарылася ў студэнта напярэдадні, а выкладчыку не хапіла праніклівасці заглянуць у душу... З гутарак са студэнтамі, выкладчыкамі выяўляліся тыя прычыны, якія парадзілі «хвасты»...

— Цэлы месяц ляжаў хворы. Запусціў вучобу...

— У мяне дачка маленькая. Не хапае часу...

— За шпаргалкі выгналі з экзамена...

— Першы залік не здала — не дапусцілі да экзаменаў. А потым пайшло і пайшло. То выкладчыка няма, то часу на падрыхтоўку не засталося. Ды і настрой ужо...

— Я з завочнага перавёўся. Яшчэ не паспеў усё даздаць...

Вядома, праблема «хвасцістаў» не з лёгкіх. І мы спадзяемся, што размову падтрымаюць студэнты і выкладчыкі.

**Л. ПЕРАСЫПКІНА,**
**Т. ЗАСІМ.**

# ДЗЯКУЙ ЗА ГАСЦІННАСЦЬ

Мы, група польскіх студэнтаў Варшаўскага універсітэта, пабывалі ў БДУ імя У. І. Леніна на вытворча - азнаямленчай практыцы. На працягу гэтага часу мы слухалі лекцыі, мелі магчымасць азнаёміцца з памятнымі месцамі Беларусі, пазнаць бліжэй яе народ.

Мы выказваем падзяку выкладчыкам філалагічнага факультэта за цікавыя лекцыі.

Хацелася б таксама падзякаваць вадзіцелю універсітэцкага аўтобуса М. М. Дудзічу. Ён дапамог нам лепш пазнаёміцца з беларускай зямлёй, з яе цудоўнымі людзьмі. Ён быў не толькі вадзіцелем, але і нашым гідам...

Вялікае дзякуй выкладчыкам І. С. Скарапанавай і М. Н. Дарашэнка, якія суправаджалі нашу групу.

З вялікай сімпатыяй будзем успамінаць студэнтаў IV курса філфака Наташу Качура і Валерыя Лабко. На працягу трох тыдняў яны пастаянна клапаціліся аб нас.

**А. ШЫМЧЫК,**
**В. ВАЛАДАМІРА,**
**В. ХАСІК.**
**(Усяго дзесяць подпісаў).**

**Камсамольскае жыццё**

# БЫЦЬ НА ПЯРЭДНІМ КРАІ

*ІДУЦЬ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫЯ СХОДЫ Ў КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ УНІВЕРСІТЭТА*

Сакратар камітэта камсамола матэматычнага факультэта В. Балашчанка падрабязна далажыў сходу аб тым, якая работа праведзена за справаздачны перыяд. Камсамольцы, выконваючы гістарычныя рашэнні XXIV з'езда КПСС і рыхтуючы дастойную сустрэчу паўвекавому юбілею нашай краіны, з усёй адказнасцю, з камсамольскім запалам выконвалі даручэнні. Зроблен яшчэ адзін крок на шляху да павышэння вучэбнай паспяховасці, асабліва ў галіне грамадскіх навук. Нядрэнна арганізоўваліся дыспуты, студэнцкія канферэнцыі, гутаркі. Адзначаны зрухі ў ваенна-патрыятычным выхаванні камсамольцаў. Адбыліся цікавыя сустрэчы з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху, паездкі на Курган Славы, у Хатынь, экскурсіі ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Адзначана шэфская работа камсамольцаў. У мінскія школы №№ 50, 81, 1 і іншыя пастаянна прыходзяць юнакі і дзяўчаты — студэнты матэматычнага факультэта. Яны чытаюць лекцыі аб універсітэце, папулярызуюць матэматыку, арганізоўваюць гутаркі, вечары. Вынікам зроблenага з'явілася павелічэнне колькасці абітурыентаў на матфаку.

Многае зроблена для насельніцтва і байцамі будаўнічых атрадаў. Усюды, дзе б яны ні працавалі — у Казахстане, у Лагойскім або Крупскім раёнах, — наладжваліся самыя цесныя і трывалыя сувязі з мясцовай моладдзю. Акрамя лекцый, канцэртаў мастацкай самадзейнасці, студэнты арганізоўвалі падрыхтоўчыя курсы для тых, хто хацеў паступіць у ВНУ. Аб вялікай эфектыўнасці гэтай работы сведчаць шматлікія пісьмы, падзякі, якія прыходзяць у дэканат. Многія байцы за выдатную выхаваўчую работу былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі.

В. Балашчанка закрануў і шэраг іншых пытанняў і, натуральна, адзначыў недахопы ў арганізацыйнай рабоце, у падборы і навучанні актыву.

Бясспрэчна, добрых паказчыкаў дасягае камітэт толькі тады, калі ён абапіраецца на сваіх памочнікаў — камсамольскіх актывістаў усіх без выключэння курсаў. Але часам актывісты не апраўдваюць давер'я. На сходзе, у прыватнасці, гаварылася аб студэнце Гідрановічу. Былы член камітэта камсамола адказваў за праверку здачы Ленінскага заліку на другім этапе. З даручэннем не справіўся. Ну, вядома, яму вынеслі вымову з занясеннем ва ўліковую картку.

Канешне, Гідрановіч вінават, але віна тут, па-мойму, і камітэта. Чаму ніхто не пацікавіўся, як ідуць справы ў таварыша, не падказаў, не параіў? Чаму, нарэшце, сам студэнт не звярнуўся за дапамогай? Зрабі ўсё гэта своечасова — і не было б такога непрыемнага здарэння, не скланялі б прозвішча Гідрановіча на ўсіх сходах і пасяджэннях.

Хацелася б сказаць таксама некалькі слоў і аб камсамольскай вучобе. Кэб кіраваць работай, людзьмі, неабходны нейкія навыкі. А дзе яны, скажам, у першакурсніка? Вось тут і павінны старэйшыя таварышы падказаць, даць карысную параду, сабрацца за «круглым» сталом і абмеркаваць дзейнасць кожнага члена камітэта. Кантроль і яшчэ раз кантроль за кожным даручэннем. Тады і вынікі будуць выдатныя, і грамадскае жыццё будзе з камсамольскім агеньчыкам.

І яшчэ. План — аснова ўсёй працы, арганізаванасці. А вось са слоў В. Балашчанкі можна зрабіць вывад, што ў камітэце адсутнічае перспектыўнае планаванне.

Абмеркавана на сходзе і злабадзённае для ўсіх студэнтаў універсітэта становішча ў інтэрнатах, паводзіны, дысцыпліна студэнтаў. Гаварылі аб тым, што студэнты вешаюць на сценах пакояў вульгарныя карцінкі, «заглядваюць у бутэльку». Іменна да такіх студэнтаў трэба прымаць больш дзейсныя меры.

У спрэчках па дакладу выступілі Іван Сандрыгайла, Сяргей Рагозін, Аляксандр Марцінкоўскі, Алена Гузава і іншыя. Яны гаварылі аб тым, што матэматычны факультэт здаў былыя пазіцыі ў спорце. Так, напрыклад, калі яшчэ параўнальна нядаўна факультэцкія спартсмены на універсітэцкіх спартакіядах займалі прызавыя месцы, то цяпер абмежаваліся толькі пятым.

З горыччу гаварылі выступаўшыя аб мастацкай самадзейнасці. На факультэце да гэтага часу існуюць толькі на паперы аркестр, хор, танцавальны ансамбль. Ці не па гэтай прычыне матэматыкі з году ў год займаюць апошнюю ступеньку ў конкурсе-аглядзе на лепшы самадзейны калектыў?

Так, ёсць поспехі. Аднак ёсць і многа нездавальняючага ў рабоце камітэта, камсамольскіх бюро. Відавочна, актыву матфака з усёй сур'ёзнасцю трэба аднесціся да слушных заўваг і пастарацца выправіць недахопы.

Работа камітэта прызнана здавальняючай. У састаў новага камітэта выбрана 16 чалавек. Узначальвае яго Таццяна Пекіна.

**В. ЗАДАЛЯ.**

**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

# НАВУЧАЮЧЫ — ДАСЛЕДАВАЦЬ

НАВУКА Ў ВНУ. Сёння для яе характэрны асабліва высокія тэмпы развіцця. Яна становіцца важкай часткай нацыянальнага навуковага патэнцыялу — аднаго з важнейшых фактараў росту вытворчых сіл краіны. Прыкметна і другая тэндэнцыя: цяпер зжывае сябе такое паняцце, як перыферыйная вузаўская навука. Колькасць вышэйшых навучальных устаноў, якія вядуць актуальныя даследаванні, рэзка ўзрастае. Усё новыя і новыя універсітэты, інстытуты выходзяць на авангардныя рубяжы сучаснай матэматыкі і фізікі, хіміі і біялогіі, гісторыі і філасофіі...

Гэты працэс непазбежна вядзе да пошуку найбольш эфектыўных форм супрацоўніцтва вучоных вну, канцэнтрацыі іх творчых сіл на асноўных напрамках навукі. Зразумела, што аб'яднанне вузаўскіх калектываў не можа прымаць форм, характэрных, скажам, для устаноў сістэмы АН СССР. У той жа час сувязі даследчыкаў, якія працуюць у вышэйшай школе, павінны — сёння гэта ўжо настойлівая неабходнасць — будавацца на планамернай і доўгатэрміновай аснове. Такім рацыянальным варыянтам кааперацыі з'яўляецца арганізацыя Паўночна-Каўказскага цэнтра вышэйшай школы. А РДУ — базавая вну Паўночна-Каўказскага навуковага цэнтра. Рашэнне партыі і ўрада аб яго стварэнні стала знамянальнай вяхой не толькі ў жыцці нашага краю. Тым самым падкрэслена ўзросшая роля вну ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Цяпер яны прызваны адначасова з падрыхтоўкай высокакваліфікаваных спецыялістаў весці ў больш шырокіх, чым раней, маштабах распрацоўку важных праблем.

У новага цэнтра вялікае кола задач: праводзіць фундаментальныя даследаванні ў галіне прыродазнаўчых і грамадскіх навук, садзейнічаць развіццю вялікага эканамічнага раёна, росту прадукцыйнасці працы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, выхоўваць навуковыя кадры, каардынаваць намаганні вну і галіновых інстытутаў, канструктарскіх бюро і г. д.

Цэнтр уяўляе сабой значнае па сваіх патэнцыяльных магчымасцях аб'яднанне. Цяпер жа на Паўночным Каўказе працуе 55 вышэйшых навучальных і 206 навукова-даследчых устаноў. Многія нашы вну добра вядомы сваімі навуковымі дасягненнямі. Узяць хоць бы Растоўскі дзяржаўны універсітэт. На 11 яго факультэтах дзейнічае 70 кафедр, працуе каля 60 прафесараў. Супрацоўнікі РДУ штогод публікуюць да тысячы работ. Аб'ём гаспадарча-дагаворных даследаванняў, якія праводзяцца для прадпрыемстваў, набліжаецца да трох мільёнаў рублёў. Істотны ўклад у навуку і ўкараненне яе дасягненняў у вытворчасць уносяць Новачаркаскі і Краснадарскі політэхнічныя, Таганрогскі радыётэхнічны, Грозненскі нафтавы, Данецкі сельскагаспадарчы і іншыя інстытуты Паўночнага Каўказа. Мясцовыя вучоныя займаюцца глыбокімі даследаваннямі ў галіне матэматыкі і механікі, геалогіі і хіміі, фізікі і біялогіі, грамадскіх, тэхнічных і сельскагаспадарчых навук.

Наш цэнтр створан на базе вышэйшых навучальных устаноў. Іх дзейнасць ён і прызван у першую чаргу планаваць і накіроўваць. Несумненная перавага такой кааперацыі заключаецца ў арганічным адзінстве педагагічнай і даследчай дзейнасці, у зліцці творчых намаганняў кафедр і лабараторый, у шырокай магчымасці прыцягнення да іх працы студэнтаў і аспірантаў.

Калектывы вну здольны вырашаць сур'ёзныя навуковыя задачы і адначасова даць новы штуршок развіццю асноўных вытворчасцей нашага краю: машынабудавання, прыборабудавання, радыёэлектронікі, сельскай гаспадаркі, хімічнай і харчовай прамысловасці, каляровай металургіі і нафтагазахіміі.

Калектыўных намаганняў патрабуе рашэнне такіх праблем, як лёс Азоўскага мора, металагенія Каўказа, горнае земляробства. Неабходна знайсці рацыянальныя формы супрацоўніцтва і каардынацыі ў комплекснай распрацоўцы пытанняў гісторыі, філасофіі, літаратуры, археалогіі шматнацыянальнага Паўночнага Каўказа.

Першы ў сістэме вышэйшай школы Паўночна-Каўказскі цэнтр непазбежна набыў эксперыментальны характар. У цяперашні час савет цэнтра, у састаў якога ўваходзяць рэктары вну, дырэктары НДІ, вядучыя вучоныя, завяршыў фарміраванне асноўных навуковых напрамкаў, вызначэнне праблематыкі работ на бягучую пяцігодку. Выкананне намечаных планаў будзе каардынавацца створанымі ў нас аддзяленнямі матэматыкі і механікі, хіміі і хімічнай тэхналогіі, фізікі, тэхнічнай кібернетыкі, радыёэлектронікі, сістэмы кіравання, біялогіі, сельскай гаспадаркі і інш. Пашыраецца навуковая база цэнтра. Пры Растоўскім дзяржаўным універсітэце арганізаваны і цяпер разгортваюць работу пяць новых НДІ: фізікі, фізічнай і арганічнай хіміі, механікі і прыкладной матэматыкі, нейракібернетыкі біялогіі. Ужо ў гэтай пяцігодцы прадугледжваецца будаўніцтва навукова-лабараторных будынкаў у Растове, Краснадары, Таганрозе, Новачаркаску.

Мы надаем вялікае значэнне строгаму ўзаемадзеянню калектываў «старых» і «новых» вышэйшых навучальных устаноў. Так, вучоныя Растоўскага дзяржаўнага універсітэта звярнуліся да сваіх калег з маладых універсітэтаў краю з прапановамі аб чытанні лекцый, вядзенні спецкурсаў сіламі сваіх вядучых прафесараў у галіне матэматыкі, механікі, фізікі цвёрдага цела, арганічнай хіміі, нейрафізіялогіі, філасофіі. У добра аснашчаных вну прадугледжваецца выкарыстанне на аснове кааперацыі вылічальнай тэхнікі, абсталявання для спектральных вымярэнняў, аналітычных і матэрыялазнаўчых даследаванняў. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена росту і перападрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў.

Вялікае значэнне намі надаецца развіццю выдавецкай дзейнасці. Намечан выпуск фундаментальных прац «Вынікі і праблемы навукі», дзе будуць адлюстраваны асноўныя дасягненні вучоных краю ў галіне тэарэтычных распрацовак. З новага года пачне выходзіць новы перыядычны часопіс «Веснік Паўночна-Каўказскага навуковага цэнтра».

Праграма дзейнасці цэнтра накіравана на рэалізацыю аднаго з асноўных патрабаванняў, вылучаных XXIV з'ездам КПСС: арганічна спалучаць дасягненні навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з перавагамі сацыялістычнай сістэмы гаспадаркі. Вось што з'яўляецца стрыжнем нашай работы. У сваёй дзейнасці мы перш за ўсё ўлічваем патрэбнасці грамадскай вытворчасці, структуру і тэндэнцыі развіцця эканомікі Паўночнага Каўказа, асноўныя напрамкі навукова-тэхнічнага прагрэсу ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, задачы, якія стаяць у галіне адукацыі, культуры, ідэйна-палітычнага выхавання працоўных.

Безумоўна, поспехі цэнтра ў многім будуць залежаць ад таго, наколькі адпрацаванымі і эфектыўнымі акажуцца сувязі навуковых і вытворчых калектываў. Мы падтрымліваем ініцыятыву вучоных Сібірскага аддзялення АН СССР, накіраваную на заключэнне дагавораў аб працяглым комплексным супрацоўніцтве з прадпрыемствамі.

Натуральна, у новай справе сустракаецца нямала цяжкасцей. У той жа час няма сумнення ў тым, што першыя крокі работы Паўночна-Каўказскага навуковага цэнтра вышэйшай школы пацвярджаюць жыццёвасць закладзенай у ім ідэі.

**Ю. ЖДАНАЎ,**
член-карэспандэнт АН СССР, старшыня савета Паўночна-Каўказскага навуковага цэнтра вышэйшай школы, рэктар РДУ.



**На здымку:** ідуць практычныя заняткі па эмбрыялогіі і гісталогіі ў студэнтаў трэцяга курса біялагічнага факультэта. Даследаванні праводзяць Дау Хак Цінь (В'етнам) і Алеся Кірылава.

Фота В. Васільева.

# ПЕРШАЯ Ў КРАІНЕ

У нашы дні цяжка ўявіць фізіку без такога раздзела яе, як сегнетаэлектрычнасць. Немагчыма без яго і далейшае развіццё сучаснай тэхнікі. Між тым гэтая галіна фізікі цвёрдага цела зусім яшчэ маладая, ёй толькі што споўнілася 50 год, і радзімай яе па праву называюць Савецкую дзяржаву.

Больш чвэрці веку сур'ёзныя навуковыя даследаванні ў галіне сегнетаэлектрычнасці вядуцца ў Растоўскім дзяржуніверсітэце. Распачатыя Н. С. Навасільцавым і А. Л. Хадаковым, яны былі інтэнсіўна прадоўжаны іх вучнямі, і ў цяперашні час у РДУ дзейнічае моцная, працаздольная школа сегнетаэлектрыкаў, вядомая ў краіне такімі буйнымі спецыялістамі, як Е. Г. Фясенка, О. І. Пракапала, І. Н. Бяляеў, О. П. Крамараў, В. З. Барадзін і іншыя.

Невыпадкова, што іменна растоўскія вучоныя з'явіліся ініцыятарамі першай у Савецкім Саюзе школы маладых фізікаў, арганізаванай на базе Паўночна-Каўказскага навуковага цэнтра. Старанная трохгадовая арганізацыйная падрыхтоўка школы вызначыла яе маштабы, высокі навуковы ўзровень і атмасферу творчай актыўнасці. Па свайму прадстаўніцтву яна выйшла далёка за межы Паўночна-Каўказскага рэгіёна і ператварылася ва ўсесаюзную школу маладых вучоных. У ёй прыняло ўдзел 120 слухачоў з 18 гарадоў нашай краіны: Масквы, Ленінграда, Кіева, Львова, Мінска, Рыгі, Ташкента, Валгаграда, Варонежа, Элісты і іншых. Для чытання лекцый у школе былі запрошаны 12 вядучых вучоных краіны, вядомых сваімі працамі ў галіне сегнетаэлектрычнасці. Сярод іх дактары фізіка-матэматычных навук, прафесары інстытута крышталаграфіі АН СССР І. С. Жолудзеў, і Л. А. Шувалаў, доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Р. П. Озераў (Масква), дацэнты В. Я. Фрыцберг (Рыга), В. В. Леманаў (Ленінград), Д. Г. Саннікаў, Б. А. Струкаў (Масква) і іншыя.

Якія ж мэты і задачы арганізацыі такіх школ?

— Сістэма школ маладых вучоных у нас яшчэ толькі ўваходзіць у практыку, — гаворыць старшыня аргкамітэта школы фізікаў, загадчык кафедры фізікі дыэлектрыкаў РДУ Е. Г. Фясенка. — У краіне хутка растуць маладыя навуковыя сілы, і ўзнікае неабходнасць неяк каардынаваць, накіроўваць гэтыя сілы. Задачай школы фізікаў было садзейнічаць развіццю тэарэтычных і эксперыментальных даследаванняў у галіне фізікі сегнетаэлектрыкаў у нашай краіне і, у прыватнасці, у Паўночна-Каўказскім навуковым цэнтры. Маладым вучоным было прачытана звыш 20 высокакваліфікаваных лекцый па асноўных праблемах фізікі сегнетаэлектрыкаў і новых прымяненнях. Перавагі такой формы вучобы несумненны. Слухачы школы на працягу дзесяці дзён мелі магчымасць не толькі вучыцца, але і весці дыскусіі па тых ці іншых навуковых праблемах, гутарыць з лектарамі, якія ў сваю чаргу ахвотна давалі кансультацыі маладым вучоным па канкрэтных даследаваннях.

Усе ўдзельнікі школы фізікаў прыйшлі да адзінадушнай думкі (і аргкамітэт падтрымаў яе), што вопыт падобных школ павінен быць прадоўжан.

СССР 50

СЁННЯ Ў НАС У ГАСЦЯХ ГАЗЕТА РАСТОЎСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА.

# ЗА СОВЕТСКУЮ НАУКУ

## СЛАЎНЫ ШЛЯХ

Растоўскі дзяржаўны універсітэт вядзе сваю гісторыю ад рускага Варшаўскага універсітэта, заснаванага ў 1869 годзе. У 1915 годзе ў сувязі з ваеннымі падзеямі Варшаўскі універсітэт быў эвакуіраван у Маскву, а затым у Растоў-на-Доне. 1 снежня 1915 года тут на ўсіх чатырох факультэтах — фізіка-матэматычным, медыцынскім, юрыдычным і гісторыка-філалагічным — пачалося чытанне лекцый.

Становішча універсітэта карэнным чынам змянілася пасля рэвалюцыі, пасля ўстанаўлення ў студзені 1920 года Савецкай улады на Доне. Толькі цяпер ён стаў сапраўды народным.

З кожным годам універсітэт пашыраўся, умацоўвалася яго навуковая і матэрыяльная база. Да канца трыццатых гадоў факультэты і кафедры РДУ былі поўнасцю ўкамплектаваны кваліфікаванымі кадрамі.

Вайна перапыніла далейшы рост універсітэта. Выконваючы патрыятычны доўг, супрацоўнікі і студэнты РДУ сталі ў рады абаронцаў сваёй сацыялістычнай Радзімы. Толькі ў першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны каля 700 студэнтаў і навуковых супрацоўнікаў пайшлі на фронт і ў ваенныя школы. Многія з іх не вярнуліся з поля бітвы. Памяць аб іх подзвігу жыве ў нашых сэрцах.

Нямецка-фашысцкія акупанты па-варварску разбурылі універсітэт. Яны разбамбілі і знішчылі будынкі фізіка-матэматычнага факультэта і навуковай бібліятэкі, ва ўсіх карпусах не працавала ацяпляльная сістэма. Бомба трапіла і ў галоўны корпус. Многія тады лічылі, што хутка аднавіць нармальную работу універсітэта немагчыма. Але калектыў РДУ не згадзіўся з гэтым і на справе даказаў правільнасць свайго погляду. Ужо да 1950 года універсітэт не толькі дасягнуў даваеннага ўзроўню ў навуковай рабоце і падрыхтоўцы кадраў, але і перавысіў яго. Гэта быў сапраўдны працоўны подзвіг!

У 1966 годзе за вялікія поспехі ў падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў для народнай гаспадаркі і ў сувязі з 50-годдзем з дня заснавання наш універсітэт быў удастоен высокай урадавай узнагароды — ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга.

## БУЙНЕЙШЫ ЦЭНТР НАВУКІ

Прызнаны цэнтр навуковага жыцця Паўночнага Каўказа Растоўскі дзяржаўны універсітэт мае слаўныя традыцыі. Імёны многіх вучоных, якія працавалі тут, трывала ўвайшлі ў гісторыю навукі. Гэта заснавальнік сучаснай вірусалогіі Д. І. Іваноўскі, вядомы рускі мовазнаўца і філолаг Я. Ф. Карскі, вучань акадэміка І. П. Паўлава, правадзейны член Акадэміі медыцынскіх навук А. Н. Ражанскі, вядомы эканаміст П. І. Ляшчанка, выдатны матэматык Д. Д. Мардухай-Балтоўскі, буйнейшы біёлаг і глебазнаўца А. Ф. Лебедзеў...

Іх эстафету падхапілі выхаванцы Растоўскай вышэйшай школы. У РДУ вучыліся віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук УССР, лаўрэат Ленінскай прэміі В. М. Глушкоў, дырэктар інстытута тэарэтычнай астраноміі АН СССР акадэмік М. Ф. Субоцін, лаўрэат прэміі імя Лабачэўскага І. В. Яфімаў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі фізік Н. А. Даброцін і многія іншыя відныя вучоныя краіны.

Можна смела сказаць, што цяперашняму пакаленню студэнтаў РДУ пашанцавала. Яны авалодваюць ведамі пад кіраўніцтвам першакласных спецыялістаў. У РДУ 55 дактароў і 379 кандыдатаў навук. Сярод іх — вучоныя, якімі па праву ганарыцца наша навука, чыя папулярнасць выйшла далёка за межы краіны: член-карэспандэнт АН СССР, доктар фізіка-матэматычных навук прафесар І. І. Варовіч, член-карэспандэнт АН СССР, доктар хімічных навук прафесар Ю. А. Жданаў, доктар фізіка-матэматычных навук прафесар М. А. Блахін, доктар біялагічных навук прафесар А. Б. Коган... Свае веды і вопыт яны шчодра перадаюць тым, каму яшчэ прадстаіць сказаць сваё слова ў розных галінах навуковых ведаў.

Ацэньваючы ролю Растоўскага універсітэта ў развіцці навукі, нельга не сказаць аб узнікшым на яго базе Паўночна-Каўказскім навуковым цэнтры вышэйшай школы РСФСР. Тут канцэнтруюцца на рашаючых напрамках навукова-тэхнічнага прагрэсу лепшыя сілы вну поўдня краіны.

## НА ТРЫВАЛАЙ АСНОВЕ

Наш універсітэт размяшчаецца ў некалькіх карпусах. У галоўным — на вуліцы Энгельса — знаходзяцца два факультэты: біёлага-глебавы і гістарычны. Юрысты, філолагі, матэматыкі і механікі вучацца ў будынку на вуліцы М. Горкага. Цэлы комплекс будынкаў прадастаўлены ў распараджэнне хімікаў. Добрая база для заняткаў і ў студэнтаў біёлага-глебавага факультэта: лабараторыі, вучэбна-вопытная гаспадарка, Батанічны сад, біястанцыя ў Новарасійску.

Будынак фізічнага, эканамічнага і філасофскага факультэтаў — самы вялікі ў РДУ. Тут у прасторным, па-сучаснаму спраектаваным будынку ў Заходнім мікрараёне, размясціліся шматлікія аудыторыі, дэманстрацыйны музей. Да пачатку гэтага вучэбнага года ў новы будынак студэнцкага гарадка перасяліўся геолага-геаграфічны факультэт.

Навуковая бібліятэка універсітэта — буйнейшы занальны метадычны цэнтр вузаўскіх бібліятэк Паўночнага Каўказа. У яе фондзе 1200 тысяч кніг, і ён штогод вырастае на 70 тысяч экземпляраў.

Сярод устаноў універсітэта, якія маюць важнае значэнне, — вылічальны цэнтр, эксперыментальныя майстэрні, іёнасферная станцыя, кніжнае выдавецтва і другія.

Студэнтам РДУ створаны ўсе ўмовы не толькі для паспяховай работы, вучобы і заняткаў навукай. У іх распараджэнні два добра абсталяваныя інтэрнаты на 630 месц. У наступным годзе будзе здадзен новы інтэрнат на 1.700 месц.

## ПА 20 СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ

На адзінаццаці факультэтах РДУ сёння вучыцца каля 10.000 студэнтаў. Універсітэт рыхтуе высокакваліфікаваныя кадры для народнай гаспадаркі па 20 асноўных спецыяльнасцях: геалагічная здымка і пошукі месцанараджэнняў карысных выкапняў; прыкладная матэматыка, радыёфізіка і электроніка; аграхімія і глебазнаўства; правазнаўства, руская мова і літаратура; гісторыя; палітычная эканомія; філасофія; псіхалогія; матэматыка; механіка; фізіка; хімія; біялогія; журналістыка; геаграфія; эканамічная кібернетыка.

Выпускнікі універсітэта працуюць у розных кутках нашай краіны. Вось даныя толькі аб некаторых з іх, закончыўшых РДУ у мінулым навучальным годзе.

У Азове працуе інжынерам-праграмістам выпускнік эканамічнага факультэта В. Талдыкін. Яго сакурсніца А. Лайпанава — асістэнт кафедры палітэканоміі ў Азова-Чарнаморскім інстытуце механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Выпускнік фізічнага факультэта Е. Слівенка — старшы лабарант астрафізічнай лабараторыі АН СССР. Маладыя геолагі А. Старчанка і Е. Баранюк працуюць у Прыморскім тэрытарыяльным геалагічным упраўленні.

Многія выбіраюць шлях навуковага пошуку, робячы свае першыя крокі ў навуку яшчэ за студэнцкай партай. Шырокую магчымасць для гэтага прадастаўляюць навуковыя студэнцкія таварыствы (НСТ), якія дзейнічаюць на кожным факультэце.

У РДУ вучацца не толькі савецкія студэнты. Выпускнікі універсітэта жывуць і працуюць зараз ужо ў многіх краінах свету. У мінулым годзе дыпломы спецыялістаў атрымалі ў нас 70 прадстаўнікоў замежных дзяржаў. Цяпер на фізічным, біялагічным, філалагічным факультэтах, у аспірантуры вучацца хлопцы і дзяўчаты з ГДР і ДРВ, з Арабскай Рэспублікі Егіпет.

## ЗАЎСЕДЫ НАПЕРАДЗЕ

Кіпучым, цікавым, змястоўным жыццём жыве студэнцкі калектыў РДУ. Задае тон у ім камсамольская арганізацыя універсітэта.

У перыяд летніх канікул студэнты выязджалі ў вёскі, праводзілі лекторыі на палітычныя, атэістычныя, прававыя тэмы. Шэфства над моладдзю калгасаў і саўгасаў стала ў РДУ добрай традыцыяй.

Студэнты вядуць актыўную работу і ў дзіцячых пакоях міліцыі, у створаных імі клубах «Праметэй», «Арбіта», «Эстэтыка».

Заключаны дагаворы аб садружнасці з моладдзю растоўскіх заводаў «Ростсельмаш», ГПЗ-10, «Сантэхарматура», «Рубін», мэблевай фірмы імя Урыцкага. Гэта дапамагае студэнтам бліжэй пазнаёміцца з вытворчасцю, робіць мацнейшымі сувязі паміж рабочым класам і студэнцтвам.

Актыўна ўдзельнічаюць камсамольцы РДУ ў асваенні «планеты «Цаліна». Кожнае лета ў вёскі выязджаюць будаўнічыя студэнцкія атрады, пакідаючы аб сабе добрую памяць школамі, клубамі, жылымі дамамі і гаспадарчымі будынкамі, пабудаванымі іх рукамі.

## З АГАНЬКОМ, ПА-СТУДЭНЦКУ

Студэнты ўмеюць настойліва авалодваць ведамі, умеюць добра, з густам арганізоўваць свой адпачынак. Пры студэнцкім клубе РДУ працуюць разнастайныя студыі, якія аб'ядноўваюць аматараў тэатра і эстрады, музыкі і літаратуры. Аглядам талентаў ва універсітэце называюць штогадовыя фестывалі мастацкай самадзейнасці.

Рукамі саміх студэнтаў створан і выдатна абсталяван на маляўнічым беразе Чорнага мора спартыўна-працоўны лагер «Ліманчык», які адзначыў у мінулым годзе сваё 15-годдзе. Актыўны адпачынак і асабліва заняткі спортам — што можа быць лепш для студэнта!

Ва універсітэце працуюць секцыі па 18 відах спорту. Спартсмены РДУ — нязменныя ўдзельнікі самых розных спартыўных спаборніцтваў.

## АДЗІНАЦЦАТЫ ФАКУЛЬТЭТ

У 1971 годзе ў дзевяці вну краіны адкрыліся факультэты прыкладной матэматыкі. Тое, што наш універсітэт аказаўся ў ліку гэтых дзевяці, невыпадкова: па забяспечанасці вылічальнай тэхнікай РДУ ўступае толькі Маскоўскаму дзяржаўнаму універсітэту.

Два гады тут будуць праходзіць навучанне будучыя спецыялісты. Гэта тыя, хто ўжо мае вышэйшую інжынерна-тэхнічную, фізіка-матэматычную або эканамічную адукацыю, а таксама стаж работы па профілю выбранай прафесіі не менш трох год. Для тых жа, хто прыходзіць на факультэт з незакончанай вышэйшай або сярэдняй тэхнічнай адукацыяй, тэрмін навучання — тры гады.

Усяго на факультэт набіраецца 175 чалавек. Пасля яго заканчэння пасланцы прадпрыемстваў будуць абавязаны вярнуцца ў свае калектывы.

Узровень падрыхтоўкі абітурыентаў вельмі высокі. Некаторыя маюць за плячыма дзве вну.

На 11 факультэце РДУ тры спецыяльнасці: матэматычнае забеспячэнне электронна - вылічальных машын, прымяненне сродкаў вылічальнай тэхнікі і матэматычнае забеспячэнне.

Спецыялісты па гэтых напрамках вельмі патрэбны сучаснай вытворчасці.



У такой дыскусіі часта можна ўбачыць студэнтаў у вялікай фізічнай аўдыторыі.

## ЛЯ ПАДНОЖЖА ТРЭЗУБЦА

— І навошта яны сюды яшчэ нейкі нікель прыплялі?

— А вы ведаеце, што такое «Нікель»?

— Ну, метал або руда. (Смех).

— Гэта дзівосная база практыкі!

— ???

**(З гутарак у кулуарах фестывалю «Вясна-72»).**

Вясной на фестывальным канцэрце біёлагі паказалі фільм. Памятаеце? Птушанят важаць. Дзяжурныя рэжуць грыбы. Горы. Родадэндроны. Студэнты дапамагаюць калгасу. Мільгаюць, мільгаюць кадры... Гледачы толькі ахаць паспяваюць. Фільм быў аб Нікелі.

Мінулым летам у маленькім пасёлку Майкопскага раёна зноў абасналіся біёлагі. Група студэнтаў прыехала сюды яшчэ ў красавіку: пашыралі сталовую, рамантавалі абсталяванне, карпусы (іх тут тры: два жылыя і адзін вучэбны), рабілі паліцы, табурэткі, правялі электрычнасць.

Жыццё ў Нікелі складаецца з многіх кампанентаў: вучэбныя заняткі ў класах, экскурсіі, узыходжанні, адпачынак, працоўныя дэсанты (гэтым летам іх было нямала). Такі Нікель у агульных рысах.

## НОВЫЯ КНІГІ ПА ПЫТАННЯХ ЭКАНОМІКІ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ СССР, ПАСТУПІЎШЫЯ Ў БІБЛІЯТЭКУ БДУ Ў КАСТРЫЧНІКУ



1. Албу, В. Ф. и др. Проблемы оптимизации развития экономического комплекса. Кишинев, «Штиинца», 1972.
2. Капитальные вложения в сельское хозяйство: планирование и эффективность. Под ред. чл.-кор. ВАСХНИЛ С. С. Сергеева. М., «Экономика», 1972.
3. Ленинские принципы социалистического хозяйствования. (Сборник статей). Минск, «Беларусь», 1972.
4. Локтев, В. П. и др. Экономическая реформа и эффективность общественного производства. Минск, «Беларусь», 1972.
5. Математические методы в экономических исследованиях. (Сборник статей). Кишинев, 1972.
6. Новожилов, В. В. Вопросы развития социалистической экономики. М., «Наука», 1972.
7. Шнипер, Р. И. Сводное планирование народного хозяйства области и района. М., «Экономика», 1972.
8. Щеренко, В. А. Экономический закон народонаселения социализма и проблемы использования трудовых ресурсов. Саратов. конф. Вильнюс, июнь 1972 г.
9. Экономические закономерности перерастания социализма в коммунизм. Материалы науч.-метод. конф. Вильнюс, инюь 1972 г. Вильнюс, 1972.
10. Экономические законы социализма и их использование. Под ред. канд. эконом. наук С. М. Лемелева. Свердловск, 1972.

# КРАЙ ПАЛЕСКІ, ПРА ЦЯБЕ СПЯВАЕМ



Гучыць песня ў актавай зале філалагічнага факультэта. Спяваюць юнакі і дзяўчаты ў форме будаўнічых атрадаў і тыя, хто сёлета упершыню пераступіў парог навучальнай установы. Сёння ў філолагаў вечар будаўнічай славы. Яго дэвіз — «Першакурснік эстафету прымае старшакурсніка спраў працоўных».

Невыпадкова спяваюць студэнты аб краі палескім. Будаўнічаму атраду «Буравеснік» выпаў вялікі гонар працаваць у Кастрычніцкім раёне Гомельскай вобласці ў славутай Рудабельскай рэспубліцы. Добра папрацавалі будучыя педагогі. Яны праклалі арашальны канал даўжынёй у 4,5 кіламетра, асвоілі 45 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Кастрычніцкі райком партыі прызнаў атрад «Буравеснік» адным з лепшых сярод атрадаў, якія працавалі тут, і ўзнагародзіў яго пераходным Чырвоным сцягам. Цэнтральны камітэт ЛКСМБ адзначыў ударную працу байцоў пераходным вымпелам. Аб поспехах студэнтаў шмат расказвала раённая газета.



Камандзір «Буравесніка» Люда Агароднік у сваім выступленні цёплым словам адзначыла тых, хто ствараў добры настрой байцоў, — паварых Валю Калітуху і Тамару Ярац, байцоў Івана Непачаловіча, Уладзіміра Ламеку, Рычарда Саматыя і іншых.

У гэтым годзе быў створан будаўнічы атрад «Верасок», які працаваў у Мінску. Але, як гавораць, молада — ды не зелена. Сярод 63 гарадскіх атрадаў «Верасок» заняў першае месца. План капіталаўкладанняў перавыканан на 25 тысяч рублёў. Атрад узнагароджан вымпелам гаркома камсамола, прадстаўлен да ўзнагароджання Граматай ЦК ВЛКСМ.

І нездарма ў сваім выступленні беларускі паэт, дацэнт універсітэта Ніл Гілевіч сказаў:

— Мы вельмі добра думалі пра вас, а вы аказаліся лепшымі, чым мы думалі. Я не баюся назваць гераічнымі вашы справы.

У час фарміравання «Вераска» многія скептыкі выказвалі сваю незадаволенасць: жаночы батальён — 20 дзяўчат і 6 хлопцаў, да таго ж камісар і камандзір — дзяўчаты. Але філалагіні даказалі, што яны не толькі ўмеюць працаваць лепш за мужчын, але і есці, як асілкі: за 45 дзён жаночы батальён з'еў 2 кіламетры 272 метры 50 сантыметраў макароны, 487 буханак хлеба, 63,5 кілаграма цукру. Адзначана па «сухому закону» 6 дзён нараджэння, зроблена 7 экскурсій. Тут нарадзіліся новыя вершы ўласных паэтаў.

— Студэнцкі будаўнічы атрад — добрая школа. Тут мы даведаліся, што такое дысцыпліна байца,—сказала камісар Люба Аўраміч.

Яна горача віншуе першакурснікаў з уступленнем у студэнцкую сям'ю і запрашае ў «Верасок».

Аб слаўных справах сваіх выхаванцаў гаварылі на вечары выкладчыкі факультэта дацэнт В. А. Захарава, прафесар М. Р. Ларчанка.

Перадаючы эстафету працоўных спраў, «старычкі» віншуюць першакурснікаў хлебам і соллю. А апошнія запэўніваюць, што наступным летам яны прадоўжаць пачэсную справу «Буравесніка» і «Вераска».

М. ЯГЕЛА.

**РАСКАЗВАЕМ АБ ЛЕТНЯЙ ПРАКТЫЦЫ.**

# МАРШРУТ—НА ПОЎНАЧ



Кожнае лета географы адпраўляюцца на практыку. Асабліва цікавай для студэнтаў цяперашняга III курса яна была ў гэтым годзе і праходзіла па чатырох маршрутах: Поўнач, Украіна і Карпаты, Крым, Каўказ. Я лічу, што нашай групе больш за ўсіх пашанцавала: шлях ляжаў на Поўнач, праз Талін, Ленінград, Петразаводск, Кіраўск, Мурманск, Архангельск. Такім чынам, мы пазнаёміліся з прыродай, эканомікай і насельніцтвам дзвюх саюзных і адной аўтаномнай рэспублік.

Як і ва ўсякім падарожжы, нас усюды чакала нешта новае, незабыўнае, непаўторнае. Ніхто не забудзе фантанаў Петрадварца і музеяў Ленінграда, разводных мастоў і набярэжную Нявы. Засталося ў памяці і возера Анега. Зачаравалі Хібіны сваёй паўночнай прыгажосцю і суровасцю. Але не ўсім удалося пакарыць іх вяршыні.

У Карэліі перад нашымі вачыма ва ўсёй велічы паўстаў буйнейшы раўнінны вадапад Ківач, размешчаны на парожыстай і хуткай рацэ Суне. Веліч розуму і працы чалавечай адкрыўся нам на востраве Кіжы на Анежскім возеры. Нават цяжка ўявіць, што гэтыя цэрквы створаны толькі пры дапамозе звычайнай сякеры і пілы і вось ужо сотні год захапляюць чалавека сваёй прыгажосцю. (На здымку злева).

Аб усім, што мы яшчэ бачылі і даведаліся на Поўначы, раскажуць стэнд «Калі ты пабачыш Поўнач, не забудзеш ніколі» і паведамленні на канферэнцыі.

Т. ДУБРОЎСКАЯ.

# БУДЗЬ ДОНАРАМ!

*Донар — гэта выратавальнік. Без перабольшання мы можам так гаварыць таму, што кроў донара выратавала жыццё многім людзям. Гэта магутны гаючы сродак, часта незаменны ніякімі лякарствамі.*

*У нашай краіне пераліванне крыві асабліва шырока прымяняецца пры цяжкіх траўмах, раненнях, апёках, пры інфекцыйных і іншых захворваннях. Ні адна цяжкая аперацыя не праводзіцца без пералівання крыві. З донарскай крыві вырабляюць гамаглабулін, фібрынаген, фібраналізін, супрацькаравую сываратку і іншыя каштоўныя прэпараты.*

*Патрэбнасць у донарскай крыві ў нашай краіне з яе шматмільённым насельніцтвам надзвычай вялікая. І тыя, хто здае сваю кроў для выратавання людзей, дастойны вялікай павагі.*

*Донарам можа быць кожны практычна здаровы чалавек ва ўзросце ад 18 да 60 год. Перад узяццем крыві донар атрымлівае лёгкае снеданне і пасля ўзяцця крыві — абед, яму прадастаўляецца два дні адпачынку. Студэнтам даецца адпачынак па даведцы, выдадзенай паліклінікай універсітэта.*

*Для здаровых людзей з нармальным саставам крыві донарства бясшкодна, што даказана шматлікімі навуковымі даследаваннямі. Узяцце ў донара невялікай колькасці крыві нікольві не ўплывае на яго самаадчуванне і працаздольнасць.*

*У цяперашні час у нашай краіне шырыцца патрыятычны рух за бязвыплатную аднаразовую дачу крыві. У некаторых вышэйшых навучальных установах нашай краіны кожны трэці студэнт і супрацоўнік з'яўляецца актыўным донарам.*

*У нашым універсітэце ў праведзеныя два Дні донара (1 сакавіка і 28 красавіка) далі кроў 471 донар. У выніку правільнай арганізацыі прапаганды донарства на хімічным, біялагічным і юрыдычным факультэтах расце колькасць донараў. Адстаюць у гэтых адносінах фізічны, матэматычны, геаграфічны і факультэт прыкладной матэматыкі. Нездавальняюча пастаўлена прапаганда донарства на факультэце журналістыкі. Па-ранейшаму мала донараў сярод выкладчыкаў, рабочых і служачых універсітэта.*

*2 лістапада адбудзецца трэці Дзень донара. Забор крыві будзе праведзен у памяшканні паліклінікі універсітэта з 9.30 да 16.00 гадзін.*

*Інстытут пералівання крыві заклікае студэнтаў, рабочых і служачых, выкладчыкаў універсітэта адзін раз у год бязвыплатна даць кроў для патрэб клінік і бальніц Мінска.*

*В. ЦІМАФЕЕЎ,*
*старшыня камітэта Таварыства Чырвонага Крыжа БДУ.*

# ШМАТ ПАБАЧЫЛІ І ПАЗНАЛІ

Другакурснікам сёлета ўдалося пабываць у многіх кутках краіны. Маршрут першай групы ляжаў праз Украіну і Малдавію. На працягу ўсёй практыкі мы знаёміліся не толькі з гарадамі, іх каштоўнасцямі, але і з характэрнымі асаблівасцямі рэльефу, глебава-расліннага покрыву і жывёльнага свету Украіны і Малдавіі. Асабліва нам запомнілася знаходжанне ў Карпатах. Незабыўным застанецца для нас той дзень, калі мы пакарылі Гаверлу — вышэйшы пункт Карпат.

Прыветліва сустрэла нас Малдавія, якая славіцца шматлікімі вінаграднікамі і садамі. Нездарма ж на гербе Малдаўскай ССР адлюстраваны вінаградныя гронкі.

Старадаўні, але ў той жа час і малады Кішынёў, расказаў нам гісторыю малдаўскай зямлі.

Многа яркіх уражанняў пакінулі сонечны горад-герой Адэса, Кіеў, Львоў і іншыя гарады. Але, нягледзячы на ўсю іх прыгажосць, мы з нецярпеннем чакалі звароту ў Мінск.

# КАЎКАЗ НЕЗАБЫЎНЫ

Першым прыпынкам у падарожжы была сталіца нашай Радзімы — Масква. З 29-га паверха Маскоўскага універсітэта перад намі адкрылася панарама аднаго з цудоўнейшых гарадоў. Хацелася заглянуць у кожны куток, праехаць па Маскве-рацэ, але гудок электравоза клікаў у дарогу ўсё далей і далей на поўдзень. За вокнамі мільгалі бярозавыя гаі, скошаныя лугі і бясконцыя палі залацістай пшаніцы. Мінулі Данецкі край, заліў Азоўскага мора, Растоў-на-Доне, Армавір... І вось ужо мы ў сталіцы Паўночна-Асецінскай рэспублікі — Арджанікідзе. Нас акружылі горы, ахутаныя лясамі, пірамідальныя таполі, чыстае і празрыстае горнае паветра. Пятляе, кружыць галаву Ваенна-грузінская дарога. Імкліва прабіваючы лабірынт скальных уцёсаў, яна гіганцкім вінтом падымаецца ўверх.

Падняліся на Гергетскі ляднік да падножжа Казбека, па дарозе пабывалі ў гасцях у чабаноў.

І зноў у дарозе. Праехалі Крыжовы перавал. Недзе ўнізе бялее тоненькай нітачкай Арагва.

Уздоўж дарогі вінаграднікі, сады і, нарэшце, Тбілісі, нешырокай паласой выцягнуты уздоўж Куры больш чым на 20 км. Горад уразіў нас сваёй маладосцю, гасціннасцю, прыгажосцю будынкаў і пышным зялёным убраннем. Недалёка раскінуўся горад металургаў і хімікаў — Руставі.

Вельмі цікавай была паездка па Арменіі. Усюды нас сустракалі гасцінна. Часта гучалі беларускія і армянскія песні.

А пасля... мора. То светла-блакітнае, то зялёнае, то шэра-чорнае.

Батумі сустрэў нас цішынёй курортнага горада. Схілы гор Аджарыі пакрыты густым лесам, перавітым ліянамі, плюшчом, з вечназялёным падлескам з лаўравішні, родадэндрону. Наведалі мы буйны чаяводчы саўгас «Чаква». Куды ні глянеш — чайныя палі, бяскрайнія зялёныя пруткія хвалі.

Незабыўныя ўражанні засталіся ад нашай паездкі па Каўказу.

Т. РАМАНАВА.

# ВЯРТАЛІСЯ АДПАЧЫЎШЫМІ

Наша практыка праходзіла па маршруту: Мінск—Гомель—Кіеў—Запарожжа — Данецк — Севастопаль — Ялта — Мінск. Мы знаёміліся з прамысловымі прадпрыемствамі гарадоў, іх гістарычнымі і культурнымі помнікамі.

Пяць дзён у Кіеве пакінулі вялікае ўражанне. Мы пабывалі ў музеі Т. Р. Шаўчэнкі, у Сафійскім саборы і Кіева-Пячэрскай лаўры, наведалі камбінат штучнага валакна і шоўкавы камбінат.

Знаёмячыся з Запарожжам, выязджалі на Днепрагэс імя У. І. Леніна і на вядомы востраў Хорціцу.

У Данецку, горадзе шахцёраў і металургаў, былі на коксахімічным і металургічным заводах, бачылі плаўку чыгуна. Відовішча незабыўнае.

Па дарозе з Данецка заязджалі ў запаведнік Асканія-Нова. Экскурсавод расказаў аб рабоце, якую праводзяць супрацоўнікі запаведніка па акліматызацыі і вывядзенню новых парод жывёл.

Наступны наш прыпынак — горад-герой Севастопаль. Тут агледзелі панараму абароны Севастопаля, дыяраму штурму Сапун-гары, Малахаў курган, наведалі помнікі героям.

Ялта ўразіла нас багатай расліннасцю і ласкавым морам. У Нікіцкім батанічным садзе мы пазнаёміліся з многімі відамі раслін з Афрыкі, Амерыкі, Аўстраліі.

С. КАНОНЧЫК, Т. ЕРАШЭНКА.



**НА ЗДЫМКУ:** алея Славы ў Кіеве. Фота **В. Германа.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Заказ 1259.
АТ 01491